МУЗЕЙ ЁСЦЬ — ГАСПАДАРА НЯМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яўгенія Васілеўна літаральна фантанавала ідэямі, марыла адкрыць у Гарадзішчы музей. Зямлячку падтрымаў мясцовы жыхар, кіраўнік будаўнічай фірмы Мікалай Гурыновіч. Разам яны вырашылі стварыць не проста музей, а культурна-асветны комплекс на базе былой пачатковай школы. Мікалай Іванавіч дапамог адрамантаваць будынак, які пуставаў, прыходзіў у заняпад. Але, як кажуць, садоўнік зразае самыя прыгожыя кветкі, а нябёсы забіраюць да сябе найлепшых людзей. Спачатку не стала Яўгеніі Васілеўны, а ў хуткім часе пайшоў у іншы свет і Мікалай Гурыновіч.

Пры жыцці Яўгенія Васілеўна не паспела давесці да канца сваю задуму, акрамя таго, што сабрала фотаздымкі жыхароў вёскі і аформіла іх у рамкі. Справу яе жыцця вырашылі прадоўжыць стараста вёскі Гарадзішча Галіна Грак і настаўніца Бокшыцкай сярэдняй школы Наталля Бартошык. Але для гэтага неабходна было знайсці сродкі. Наталля Пятроўна склала бізнес-план і падала на конкурс праектаў у Міжнародны фонд падтрымкі мясцовых супольнасцяў, які выдзеліў грошы. Ды іх неабходна было асвоіць за паўгода — такая ўмова. У адваротным выпадку сродкі належала вярнуць назад. І пачалася сапраўдная гонка, каб паспець усё зрабіць у азначаныя тэрміны. І гэта ўдалося цаной вялікіх высілкаў і намаганняў.

Акрамя трох музейных залаў з экспазіцыямі тут уладкавалі яшчэ і этнаграфічны пакой. У гэтым цалкам заслуга педагога-філолага Валянціны Дзяшчэні. Валянціна Станіславаўна можа працаваць з любым інструментам: і цвік прыбіць, і шрубу закруціць, і нешта адрамантаваць. Таму для афармлення этнаграфічнага пакоя не давялося звяртацца па дапамогу іншых. У экспазіцыі шмат цікавых прадметаў, якія адлюстроўваюць побыт менавіта жыхароў Гарадзішча. У прыватнасці, толькі ў гэтай мясцовасці выраблялі гумовыя чаравікі, так званыя гумы. Некалькі пар гэтага арыгінальнага абутку ўдалося сабраць з дапамогай неабыякавых людзей.

Выпуск Гарадзішчанскай школы 1953/1954 года.

Дзевятнаццатага студзеня мінулага года, напярэдадні 65-гадовага юбілею Яўгеніі Сыцько, адбылася прэзентацыя музея для Фонду. «Мы паслалі Яўгеніі Васілеўне на неба падарунак, знак, што мару яе ажыццявілі», — кажа Наталля Бартошык.

А дзевятнаццатага мая прайшло ўрачыстае адкрыццё музея. Сабралася шмат гасцей: жыхары вёскі, землякі, якія жывуць у розных кутках Беларусі, прадстаўнікі грамадскасці, мясцовай і раённай улад. Адзвінелі ўрачыстасці і пачаліся будні...

Стварыць музей — адна справа. Яго трэба яшчэ і ўтрымліваць. Для гэтага неабходныя сродкі, пастаянная крыніца фінансавання. Папершае, любы будынак зімой патрабуе ацяплення, хоць бы два разы на тыдзень. А гэта не проста вясковая хата, а музей, дзе сабраны гісторыка-культурныя каштоўнасці, для захавання якіх неабходны спрыяльны тэмпературны рэжым. Інакш праз колькі гадоў яны стануць непрыгоднымі. Першыя сляды разбурэнняў ужо праявіліся: з-за холаду, вільготнасці пачалі псавацца ламінаваныя дакументы. З палівам ніхто не дапамог, не адгукнуўся на шматлікія просьбы. Дровы для ацяплення новая стараста вёскі Галіна Вадзімаўна Грак шукае сама. Яна не толькі паліць у печцы, але і мые падлогу, прыбірае снег у двары, летам косіць траву, а за электрычнасць плаціць са сваёй кішэні. Перагарэла лямпачка, сапсавалася сігналізацыя — майстар не будзе працаваць за «дзякуй».

Будынак музея знаходзіцца на балансе Бокшыцкага сельсавета. Але сапраўднага гаспадара, які б нёс персанальную адказнасць за стан памяшкання, гісторыка-культурныя каштоўнасці, няма.

Уладзімір ГАРБЕНКА, старшыня Бокшыцкага сельвыканкама тлумачыць: — Будынак былой пачатковай школы, дзе цяпер знаходзіцца музей, быў у непрыглядным стане, разбураўся і прызначаўся пад знос. Але былая стараста знайшла спонсараў, былых вучняў гэтай навучальнай установы, якія дапамаглі адрамантаваць будынак. Дом утрымліваецца на балансе сельсавета як жылы. Перавесці яго ў нежылы фонд праблематычна. Акрамя таго, музей не мае афіцыйнага статусу. Для яго атрымання неабходна, каб ён стаў філіялам іншага музея. У гэтым выпадку можна гаварыць аб стаўцы вартаўніка, загадчыка або дырэктара. Цяпер прыглядвае за музеем наша работніца — стараста вёскі.

Што датычыцца ацяплення, то ніхто не мае права забяспечваць дровамі бясплатна. Іх можна выпісаць у лясгасе за грошы.

Сельсавет паставіў агароджу вакол будынка, адрамантаваў калодзеж у двары. Чым зможам, будзем дапамагаць і ў далейшым.

Наталля Бартошык і Валянціна Дзяшчэня — проста валанцёры, якія добраахвотна ўзялі на сябе цяжкую ношу, якая на іх і трымаецца. У жанчын шмат ідэй і планаў па далейшым развіцці музея. Напрыклад, у падсобным памяшканні абсталяваць беларускую хатку з усімі ўласцівымі ёй атрыбутамі, абстаноўкай, побытавымі прадметамі. У Гарадзішчы пакуль яшчэ жывуць умельцы, якія валодаюць рознымі відамі рамесніцкай дзейнасці. Ёсць людзі, якія пякуць хлеб па старадаўніх рэцэптах, плятуць кошыкі, вышываюць крыжыкам і гладдзю, што на сённяшні дзень рэдкасць. Ёсць тыя, хто валодае сакрэтамі вырабу гумаў, валёнак. «Хацелася б стварыць пры музеі школу рамеснікаў», — кажуць мае суразмоўніцы.

Музей мог бы стаць цэнтрам патрыятычнага выхавання школьнікаў, падлеткаў на прыкладзе людзей, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё малой радзімы. Тут яны маглі б весці даследчую дзейнасць. Валянціна Дзяшчэня, напрыклад, удзельнічала ў конкурсе навукова-даследчых і творчых работ «Тут родныя трымаюць карані» ў намінацыі «Гісторыя дзяржавы ў гісторыі маёй сям'і» і атрымала першае месца ў раёне. А вучаніца Наталлі Пятроўны Алеся Бартошык пашыла касцюм дзяўчыны-дрыгавічанкі і стала трэцяй у конкурсе даследчых работ «Спадчына Беларусі» ў намінацыі «Матэрыяльная культура».

— Праект закончаны, і я магу ўсё кінуць і пайсці, хоць і прыкіпела да гэтага музея ўсім сэрцам і душой, — кажа Наталля Бартошык. — Хацелася б, каб ён жыў, радаваў людзей.

Калі, як не ў Год малой радзімы, спадзявацца, што гэтыя словы будуць пачутыя?

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Кніжныя лідары мінулага года

Найбольшая колькасць прададзеных асобнікаў з выданняў на беларускай мове ў 2018 годзе ў кнігі «Дзіцячы атлас Беларусі».

Стала добрай традыцыяй складанне рэйтынгаў продажу кніг у сістэме ААТ «Белкніга», гандлёвая сетка якой самая буйная ў нашай краіне і складае болей як 100 кнігарняў. Найчасцей пакупнікі звярталіся летась да «Дзіцячага атласа Беларусі» (Мінск, «Мастацкая літаратура») — і набылі 636 экзэмпляраў. На другім месцы — «Гэта Беларусь, дзетка!», гэтага выдання прададзена ў «Белкнізе» 537 асобнікаў. У тройцы «пераможцаў» — і раман Віктара Марціновіча «Ноч» (446 асобнікаў кнігі прададзена ў 2018 годзе).

Што болей чытаюць беларусы з класікі? Раманы і аповесці Уладзіміра Караткевіча (найболей — «Дзікае паляванне караля Стаха»: набылі 308 асобнікаў), «Новую зямлю» Якуба Коласа, «Міколку-паравоза» Міхася Лынькова. Па-ранейшаму ў рэйтынгу 50 найбольшых продажаў — шмат кніг, адрасаваных дзіцячаму чытачу: «Мая мілая ведзьма» Валерыя Гапеева, «У бары жывуць сябры» Міколы Бусько, «Прыгоды Васі Лайдачкіна» Генадзя Аўласенкі, «Казкі сінявокай зямлі» Таццяны Дамаронак, «Мяне завуць Лахнэска» Алены Масла, «Прыйдзі, дзень-залацень!» Паўла Місько, «Шчодрая вавёрка» Янкі Галубовіча, «Дзедава жалейка» Сяргея Давідовіча. Толькі зборнік гісторыка-краязнаўчых апавяданняў Міколы Маляўкі «Спадчына, або Каб не стаць манкуртам» набылі 179 пакупнікоў.

Сяргей ШЫЧКО.

Пункты судакранання

Турызм з прыцэлам на будучыню

Урачыстая цырымонія адкрыцця Года адукацыі Беларусі ў Кітаі адбылася ў Далянскім політэхнічным універсітэце.

«Супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай у адукацыйнай сферы з'яўляецца для нас адным з прыярытэтных кірункаў, — падкрэсліў, адкрываючы мерапрыемства, **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА**. — Мы зацікаўлены ў далейшым пашырэнні беларуска-кітайскіх кантактаў, паступальным нарошчванні міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва, узаемадзеянні паміж дзвюма дзяржавамі ў галіне сумеснай падрыхтоўкі кадраў. Але галоўнае — у Год адукацыі Беларусі ў Кітаі мы хацелі б адкрыць нашу краіну для прадстаўнікоў кітайскіх навучальных устаноў і грамадзян Кітая, пазнаёміць іх з гасцінным беларускім народам, культурай, гісторыяй і, вядома, з сістэмай адукацыі Беларусі».

Ігар Карпенка паведаміў, што ў 2019 годзе будзе рэалізоўвацца праграма адукацыйнага турызму «Адукацыйная карта Беларусі», у ходзе якой запланавана правядзенне азнаямленчых тураў для грамадзян, прадстаўнікоў кансалтынгавых кампаній, спецыялізаваных сродкаў масавай інфармацыі Кітая ў беларускія ўстановы адукацыі. Будуць арганізаваны маладзёжныя і студэнцкія абмены, праведзены ўзаемныя прэзентацыі адукацыйных магчымасцяў Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі.

У Беларусі на нацыянальным адукацыйным партале будзе створаны інфармацыйна-навучальны сегмент з весткамі аб сістэме адукацыі і культуры Кітая, весткамі для вывучэння кітайскай мовы, вынікамі даследаванняў аб развіцці беларуска-кітайскіх адносін.

Плануецца таксама правядзенне форумаў, фестываляў, канферэнцый, семінараў, прысвечаных культуры і гісторыі Беларусі і Кітая, летніх школ для студэнтаў і школьнікаў, іншых мерапрыемстваў, якія спрыяюць узаемнай пазнавальнасці нашых сістэм адукацыі і актывізацыі ўзаемадзеяння дзвюх краін у сферы адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ГІСТАРЫЧНАЕ ФЕХТАВАННЕ — У КУЛЬТУРНАЙ ПРАГРАМЕ II ЕЎРАПЕЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

У мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага падпісана пагадненне аб правядзенні выстаўкі «Еўрапейскія баявыя мастацтвы: ад кузні Вулкана да мастацтва Марса» ў рамках культурнай праграмы II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Подпісы пад дакументам паставілі дырэктар дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска» Галіна Ладзісава і старшыня федэрацыі гістарычнага фехтавання Італіі, ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у Брэшыі Раберта Гоці.

Менавіта ён падтрымаў ідэю беларускай чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі па фехтаванні Алены Бяловай правесці падчас II Еўрапейскіх гульняў унікальную выстаўку і паказальныя выступленні па гістарычным фехтаванні — Invitational Gala Tournament. Hema in the Cultural Program of 2nd European Games Minsk 2019.

У ходзе выстаўкі, якая пройдзе ў Мінску з 27 красавіка да 10 верасня 2019 года, жыхары і госці беларускай сталіцы змогуць азнаёміцца з унікальнай калекцыяй старадаўніх кніг, шпаг і фехтавальных масак.

— *Ідэя выстаўкі спадабалася дыпламатычным інстытутам, МЗС, Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў. На дадзены момант гэта стане самым знакавым праектам, калі-небудзь рэалізаваным у гістарычным фехтаванні ва ўсім свеце. Баявыя мастацтвы ў дадзеным выпадку раскажуць пра Еўропу, пачынаючы з дагістарычных часоў да XX стагоддзя,* — расказаў Раберта Гоці.

— *Сучаснае спартыўнае фехтаванне і гістарычнае фехтаванне маюць адны карані. Гістарычнае фехтаванне ўвайшло ў міжнародную федэрацыю гэтага віду спорту і распаўсюдзілася па ўсім свеце. Асаблівую папулярнасць гэты від заваяваў у Італіі. Падчас II Еўрапейскіх гульняў мы ўбачым у Мінску 150 найлепшых майстроў гістарычнага фехтавання*, — падкрэсліла Алена Бялова.

Намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль Котаў пацвердзіў, што арганізатары II Еўрапейскіх гульняў імкнуцца з дапамогай гістарычнага фехтавання паказаць сувязь стагоддзяў. *«Гэта больш, чым від спорту. Гэта культурны і навуковы пласт. Мерапрыемства добра ўпісваецца ў агульную канцэпцыю мультыспартыўнага форуму, паказваючы сувязь традыцый з сучаснасцю. У аматараў спорту будзе выдатная магчымасць у інтэрактыўным рэжыме пазнаёміцца з атмасферай, у якой зараджаліся гэтыя складаныя, але прыгожыя спаборніцтвы. Разам з выстаўкай, цікавымі момантамі стануць турнір і інтэрактыў. У інтэрактыўным фармаце на выстаўцы можна будзе ўбачыць рэканструяваныя інтэр'еры XIV—XVI стагоддзяў, у якіх праходзілі трэніроўкі і вырабляўся інвентар. Акрамя таго, на плазменных экранах можна будзе панаціраць за асобнымі элементамі гістарычных рэканструкцый».*

Унікальнасць выстаўкі пацвярджае і той факт, што тут будуць прадстаўлены манускрыпты, узрост якіх большы за 500 гадоў.

Паказальныя выступленні майстроў гістарычнага фехтавання пройдуць у Верхнім горадзе з 22 да 23 чэрвеня 2019 года.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.